Радыё Свабода

ЛЮДЗІ

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі масавыя затрыманьні

16 жнівень 2023, 14:28

Як стала вядома Свабодзе, сярод затрыманых — намесьнік дырэктара ў навуцы і загадчыкі аддзелаў.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) у Менску 16 жніўня супрацоўнікі КДБ затрымалі сама меней 7 чалавек. Сярод затрыманых — намесьнік дырэктара ў навуцы і загадчыкі аддзелаў.

Пазаўчора, 14 жніўня, на пасаду дырэктара згаданага архіва быў прызначаны Міхаіл Глушакоў, які працаваў да гэтага кансультантам аднаго з дэпартамэнтаў Міністэрства юстыцыі. Паводле зьвестак «Нашай нівы», ён працяглы час служыў у КДБ.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:
Нацыянальны гістарычны архіў узначаліў былы супрацоўнік КДБ

Гэта ня першая хваля рэпрэсій у НГАБе.

У пэрыяд, калі дырэктарам архіва (травень 2022-га – студзень 2023-га) быў генэрал-маёр Алег Воінаў, які цяпер займае пасаду дырэктара Дэпартамэнту архіваў і справаводзтва Міністэрства юстыцыі, з палітычных матываў з НГАБ звольнілі звыш 15 чалавек.

ГЛЯДЗІЦЕ ТАКСАМА:

Скандалы, крымінальныя справы, палітрукі. Што было на «Беларусьфільме» раней і чаго чакаць пры новым дырэктару